# ФРАНЦЫСК СКАРЫНА Ў МЕДЫЦЫНЕ

**Іотчанка Дзіяна Алегаўна, Беларусь**
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт*
*Беларусь, Мінск*
*Навуковы кіраўнік – ст. выкладчык Ратынская Н.В.*

Воссоздание хронологической цепи событий, связанных с получением диплома доктора медицинских наук Франциском Скориной; представление известного книгопечатника как врача.

*Ключевые слова: Франциск Скорина, медицина, Падуанский университет, экзамен, книгопечатание, зал Сорока, философия, доктор медицины.*

# FRANCIS SKARYNA IN MEDICINE

**Iotchenko Diana Olegovna, Belarus**
*Belarusian State Medical University*
*Belarus, Minsk*
*Scientific supervisor– senior lecturer Ratunskaya N. V.*

The reconstruction of the chronological chain of events connected with the receipt of the Doctor of Medical Sciences diploma by Francis Skaryna; representation of the famous book printer as a doctor.

*Keywords: Francis Skaryna, medicine, University of Padua, exam, book printing, hallof Forty, philosophy, doctor of medicine.*

Францыск Скарына – адна з самых значных гістарычных постацяў. Чалавек, які зрабіў для культуры неверагодна шмат. Яго імем называюць праспекты, вуліцы, бібліятэкі, універсітэт… Сяродвялікіхлюдзейнашайзямліёнстаіцьбадайштонапершыммесцы.Скарына- і вучоны, і пісьменнік, і выдатны асветнік. Але самае галоўнае – ён першадрукар не толькі ў Беларусі, а наогул на ўсіх усходнеславянскіх землях. На жаль, пра жыццё Скарыны захавалася вельмі мала звестак. Ён нарадзіўся ў сям'і купца ў старажытнай сталіцы беларускай зямлі – Полацку. У Полацку Скарына атрымаў першапачатковую адукацыю, вывучыў лацінскую мову, якая адкрылаяму шлях да адукацыі. Скарына скончыў Кракаўскі ўніверсітэт з вучонай ступенню бакалаўра філасофіі. Але юнак прагнуў ведаў і празнекаторы час апынуўся ў Італіі. Закончыўшы Падуанскі ўніверсітэт, Скарына атрымаў дыпломдоктарамедыцыны.

Мэта працы – узнавіць храналагічны ланцуг падзей, звязаных з атрыманнем дыплома доктара медыцынскіх навук; пашырыць аб’ём ведаў аб вядомым кнігадрукару, як аб лекары; сфармаваць больш поўнае ўяўленне аб фігуры Францыска Скарыны, як доктара медыцынскіх навук.

Першыя звесткі аб навучанні Францыска Скарыны медыцыне датуюцца 4 лістападам 1512 года, калі ён апынуўся ў Падуанскім універсітэце і падаў заяву аб абароне вучонай ступені доктара медыцынскіх навук. Але насуперак распаўсюджанаму меркаванню, Скарына ў Падуанскім універсітэце не вучыўся,



Репозиторий БГМУ

а прыбыў туды менавіта для здачы экзамену на навуковую ступень, пра што сведчыць запіс ва ўліковай кнізе ўніверсітэта, датаваны 5 лістапада 1512 года: «... прыбыў нейкі вельмі вучоны бедны малады чалавек, доктар мастацтваў, родам з вельмі аддаленых краін, магчыма, за чатыры тысячы міль і больш ад гэтага слаўнага горада, для таго, каб павялічыць славу і бляск Падуі, а таксама квітнеючай сходу філосафаў гімназіі і святой нашай Калегіі. Ён звярнуўся да Калегіі з просьбай дазволіць яму ў якасці дару і асаблівай ласкі падвергнуцца ласкай божай выпрабаваннем у галіне медыцыны пры гэтай святой Калегіі. Калі, Вашы правасхадзіцельства, дазволіце, то прадстаўлю яго самога. Малады чалавек і вышэйзгаданы доктар носіць імя спадара Францыска, сына нябожчыка Лукі Скарыны з Полацка, русін ... «. Дагэтуль ён вучыуся 5 год на медыцынскім факультэце ў Кракаве (пэўны перыяд невядомы).

Хоць ва ўліковай кнізе Падуанскага ўніверсітэта ён запісаны як бедны студэнт, гэта не значыць, што ў яго зусім не было грошай. Тады чалавек называў сябе бедным, калі не было сродкаў, каб вучыцца, а трэба дадаць, што здача экзамена на навуковую ступень была дарагім мерапрыемствам. Так што хоць Францыск і быў купецкім сынам, сума гэтая аказалася для яго непад'ёмнай.

Але Скарыну ўсё ж такі дапусцілі да экзамену. І 6 лістапада 1512 года адбыўся папярэдні экзамен, а ўжо 9 лістапада пасля бліскучага адказу Францыска Скарыны члены калегіі галасуюць аднагалосна, каб надаць яму ступень доктара медыцыны.

Канешне, у той час медыцына была зусім іншай. Так, напрыклад, прадметамі, якія вывучаў Скарына, былі «Тэарэтычная медыцына» і «Практычная медыцына». Але на самой справе абодва былі тэарэтычнымі. Нават «практычная медыцына» была не столькі пра лячэнне людзей, колькі пра тэорыю лячэння. Яшчэ «фармацэўтыка», у асноўным травяная медыцына, а таксама «хірургія», гэта быў агульны тэрмін для анатоміі.

Не дзіўна, што Скарына, які атрымаў ступень доктара філасофіі, пачаў вывучаць медыцыну. Лекары тады не ўступалі ў кантакт з хворымі. Усё абапіралася на кнігі. Нават хірургія была тэорыяй. Хто быў практыкам, дык гэта цырульнікі, якія мелі анатамічную практыку, таму што ўскрывалі абсцэсы і пускалі кроў.А хірургі нават не чапалі сваіх пацыентаў. Але да іх Скарына не меў дачынення.

Медыцынскую практыку ён усё ж такі атрымаў.Як сведчаць некаторыя крыніцы, медыцыне Францыск Скарына прысвяціў апошнія гады свайго жыцця. Ён лекаваў біскупа Яна з Вільні (пазашлюбнага сына караля Жыгімонта Старога) і герцага Прусіі Альбрэхта з Кенігсберга, а напэўна і іншых людзей рангам ніжэй.

Падуанскі ўніверсітэт захаваў памяць пра Францыска Скарыну: яго партрэт знаходзіцца сярод найбольш знакамітых выхаванцаў універсітэта ў адной з аўдыторый, названай *Залай сарака.* У верхняй частцы партрэта змешчаны надпіс: «*FranciscusSkorynadePoloczko 1512*».



Репозиторий БГМУ

Дакладна вядома, што Францыск Скарына ганарыўся сваёй вучонай ступенню: у кожнай сваёй друкаванай кнізе ён пісаў: «вучоны муж у лекарскіх навуках доктар Францыск Скарына з слаўнага горада Полацка».

У адной з прадмоў Скарына выказаўся як узнёслы патрыёт сваёй зямлі: "… звяры, што ходзяць у пустыні, ведаюць ямы свае, птушкі, што лётаюць у паветры, ведаюць гнёзды свае, рыбы, што плаваюць па моры і ў рэках, адчуваюць віры свае, пчолы і ім падобныя бароняць вуллі свае. Гэтак жа і людзі, - дзе нарадзіліся, да таго месца і вялікую ласку маюць". З гэтымі словамі Францыск Скарына і ўвайшоў у гісторыю нашай Радзімы.

Літаратура

1. Актовая запись Падуанского университета о допущении Ф. Скорины к испытанию на степень доктора медицинских наук, 6 ноября 1512 года // Сборник документов о жизни и деятельности Ф. Скорины || По изд.: Франциск Скорина и его время. Энциклопедический справочник. Мн., 1990. С. 584—603. – Эл. версия: 2002. HTML, архив RAR: 55 kb.